Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”
Кафедра беларускага мовазнаўства

В.Э. Зіманскі

ГІСТОРЫЯ ПІСЬМА
Літарна-гукавое пісьмо

Метадычныя рэкамендацыі

Віцебск
ВДУ імя П.М. Машэрава
2016

Репозиторий ВГУ

УДК 811.161.3’0(075.8)
ББК 81.411.3-03я73
З-62

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”. Пратакол № 5 ад 25.05.2016 г.

Аўтар: дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат філалагічных навук, дацэнт **В.Э. Зіманскі**

Р э ц э н з е н т :
загадчык кафедры беларускага мовазнаўства ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат філалагічных навук, дацэнт *Г.А. Арцямёнак*

Зіманскі, В.Э.
З-62 Гісторыя пісьма: Літарна-гукавое пісьмо : метадычныя рэкамендацыі / В.Э. Зіманскі. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2016. – 46 с.

У метадычных рэкамендацыях прапануюцца дадатковыя матэрыялы да лекцыйнага курса па ўводзінах у мовазнаўства па раздзеле “Гісторыя пісьма”. Сістэмна выкладаецца працэс станаўлення пісьмовых сістэм. У другой частцы вучэбнага выдання разгледжаны літарна-гукавыя пісьмовыя сістэмы.

Адрасуецца студэнтам і выкладчыкам філалагічных факультэтаў, а таксама ўсім, хто цікавіцца ўзнікненнем і развіццём пісьмовых сістэм у гісторыі чалавецтва.

УДК 811.161.3’0(075.8)
ББК 81.411.3-03я73

© Зіманскі В.Э., 2016
© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2016

Репозиторий ВГУ

ЗМЕСТ

Уступ ……. 4
Літарна-гукавое пісьмо …….. 6
Кансанантна-гукавое пісьмо …….... 8
Вакалізавана-гукавое пісьмо …… 24
Заключэнне ……... 43
Літаратура ……. 44

Репозиторий ВГУ

УСТУП

Ні адна з сістэм пісьма практычна ніколі не існавала ў чыстым выглядзе і не існуе нават цяпер. Напрыклад, большасці літар нашага алфавіта (“а”, “б”, “в” і інш.) адпавядае адзін пэўны гук, але ў літарах-знаках “я”, “ю”, “ё” – ужо некалькі гукаў. Не можам мы абысціся і без элементаў ідэаграфічнага пісьма, скажам, у матэматыцы. Замест таго, каб пісаць словамі "да двух дадаць два будзе чатыры", мы, выкарыстоўваючы ўмоўныя знакі, атрымліваем вельмі кароткую форму: 2 +2 = 4. Тое ж – у хімічных і фізічных формулах. Самыя раннія алфавітныя тэксты былі выяўленыя ў Бібліі (Бібласе, Ліван).



У агульнай гісторыі развіцця пісьменства літарна-гукавое пісьмо сфарміравалася значна пазней за складовае. Гэта, на думку некаторых даследчыкаў [19], тлумачыцца тым, што літарна-гукавыя сістэмы падразумяваюць ужо больш развітую здольнасць да раскладання маўлення на найпрасцейшыя яе элементы – гукі (фанемы), чым гэта назіралася ў перыяд фарміравання папярэдніх пісьмовых сістэм.

Аднымі з першых літарным гукавым пісьмом сталі карыстацца тыя народы, у мове якіх галосныя гукі былі не такія важныя, як зычныя. Так, у канцы II тысячагоддзя да н.э. алфавіт узнік у фінікійцаў, старажытных яўрэяў, арамейцаў. Напрыклад, у яўрэйскай мове пры даданні да зычных К - Т - L розных галосных атрымліваецца сямейства аднакарэнных слоў: KeToL - забіваць, KoTeL - забойца, KaTuL - забіты і т. п. На слых заўсёды зразумела, што гаворка ідзе пра забойства. Таму пісалі толькі зычныя – семантыка слова была зразумелая з кантэксту. Дарэчы, старажытныя яўрэі і фінікійцы пісалі радкі справа налева. Гэты найстаражытнейшы спосаб пісьма захоўваецца ў яўрэяў і дагэтуль, такім жа спосабам сёння пішуць усе народы, якія выкарыстоўваюць арабскі алфавіт.

Шлях да раўнапраўнага абазначэння зычных і галосных быў доўгім. Ужо ў заходнесеміцкіх сістэмах пісьма для абазначэння галосных часам

Рэпозиторий ВГУ

выкарыстоўвалі так званыя matres lectionis (літаральна *маці прачытання*) – знакі, якія дапамагаюць чытаць. Гэта некалькі знакаў для зычных, якімі абазначалі падобныя на іх галосныя. Гаворка ідзе пра чатыры зычныя гукі – [w], [j], ['], [h] (апошнія два – адмысловыя гукі семіцкіх моў). Гукі [w], [j] былі блізкія да галосных [u], [i], а зычныя ['], [h] былі падобныя на галосны [a]. Калі фінікійскай мовай пачалі карыстацца грэкі, абазначэнне галосных стала абавязковым. Спачатку выкарыстоўвалася matres lectionis, пазней знакі для галосных сталі адрозніваццa ад знакаў для зычных. Так, у лацінскім пісьме першапачаткова быў адзін толькі знак 'V', які перад галосным заўсёды чытаўся як зычны 'W', а паміж зычнымі – як галосны гук 'U'. Потым гэты знак як бы раздвоіўся на 'V' і 'U' (таму яны падобныя графічна). У сучасным грэчаскім пісьме літары, якія абазначаюць галосныя, раўнапраўныя з літарамі, якія абазначаюць зычныя (усе літары стаяць у радку разам).

А ў рускай мове адбыўся адваротны працэс: літара для зычнага Й утварылася ад літары для галоснага И (прыйшлося толькі дадаць да яе надрадковы значок). Так з'явілася гука-літарнае пісьмо, у якім пісьмовы знак абазначае не слова, не марфему, а гук. Пісьменнасць больш не спрабавала напрамую перадаваць сэнс, як піктаграфія або іерагліфіка, яна проста фіксавала гукавы паток, і гэты шлях паказаў сябе найбольш эфектыўным.

Літарна-гукавое, або алфавітнае, пісьмо стала вяршыняй графічнай эвалюцыі. Яно найбольш эканомна (гукаў у мове менш, чым складоў, а складоў менш, чым слоў) і падыходзіць для моў усіх тыпаў, чаго нельга сказаць пра іншыя віды пісьма: пісьменнасць, якая складаецца толькі з слоўных знакаў, нязручная, напрыклад, для моў з багатым словазмяненнем (як абазначаць асобныя марфемы?); складовыя пісьменствы не вельмі падыходзяць для моў з вялікай колькасцю зычных.

Репозиторий ВГУ

ЛІТАРНА-ГУКАВОЕ ПІСЬМО

Літарна-гукавым прынята называць такое пісьмо, у якім кожны графічны знак (літара) абазначае не цэлае слова, як у ідэаграфіі, і не склад, як у складовым пісьме, а асобны тыповы гук – фанему. Таму літарна-гукавое пісьмо часам называюць таксама фанемаграфічным і нават фанематычным.

Адзін з першых алфавітаў на Зямлі – фінікійскі. Ад фінікійцаў – жыхароў усходняга ўзбярэжжа Міжземнага мора, марскіх гандляроў і падарожнікаў – літарна-гукавое пісьмо перайшло да грэкаў. Ад грэкаў дадзены прынцып пісьма пранік у Еўропу. Ад арамейскага пісьма, як лічаць даследчыкі, сваё паходжанне вядуць амаль усе літарна-гукавыя пісьмовыя сістэмы народаў Азіі.

У алфавіце фінікійцаў было 22 літары. Яны размяшчаліся ў пэўным парадку ад `алеф, бэт, гімель, далет ... да таў. Кожная літара мела асэнсаваную назву: `алеф – вол, бэт – дом, гімель – вярблюд і гэтак далей. Назвы слоў як бы распавядаюць аб стварыўшым алфавіт народзе, паведамляючы пра яго самае галоўнае: народ жыў у дамах (бэт) з дзвярамі (далет), пры пабудове якіх выкарыстоўваліся цвікі (ваў). Ён займаўся земляробствам, выкарыстоўваючы сілу валоў (`алеф), жывёлагадоўляй, рыбнай лоўляй (мем – вада, нун – рыба) або вандраваў (гімель – вярблюд). Ён гандляваў (тэт – груз) і ваяваў (зайн – зброя).



Эвбея	Иония	Афины	Коринф	Современные заглавные буквы	Современные строчные буквы	Транслитерация	Название греческой буквы
AA	AA	AA	AA	Α	α	a	альфа
B	B	B	⊔⊓	Β	β	b	бета
<C	Γ	Λ	(<	Γ	γ	g	гамма
DD	Δ	Δ	Δ	Δ	δ	d	дельта
ꟻE	ꟻE	ꟻE	B	Ε	ε	e	эпсилон
F	—	F	F	F	F	w	дигамма
I	I	I	I	Ζ	ζ	zd	дзета
—	⊟H	—	—	Η	η	ē	эта
⊟H	—	⊟H	⊟H		—	h	
⊗⊕⊙	⊗⊕⊙	⊗⊕⊙	⊗⊕⊙	Θ	θ	th	тета
ı	ı	ı	⊂	Ι	ι	i	йота
K	K	K	K	Κ	κ	k	каппа
L	ΓΛ	L	ΓΛ	Λ	λ	l	ламбда
⋔⋔M	⋔M	⋔M	⋔M	Μ	μ	m	мю
⋔N	⋔N	⋔N	⋔N	Ν	ν	n	ню
X	Ξ	(XS)	Ξ	Ξ	ξ	ks	кси
O	O	O	O	Ο	ο	o	омикрон
⊓⊓	Γ	Γ	Γ	Π	π	p	пи
M(?)	—	—	M	Μ	—	s	сан
ϙ	ϙ	ϙ	ϙ	Ϙ	ϙ	k	коппа
P	PD	PR	PR	Ρ	ρ	r	ро
⊂	⊂	⊂	—	Σ	σς	s	сигма
T	T	T	T	Τ	τ	t	тау
⋔YV	VY	⋔YV	⋔YV	Υ	υ	u	ипсилон
ΦΦ	Φ	ΦΦ	ΦΦ	Φ	φ	ph	фи
ΨΨ	X	X	X	Χ	χ	kh	хи
(ΦS)	ΨΨ	(ΦS)	ΨΨ	Ψ	ψ	ps	пси
—	ΩΩ	—	—	Ω	ω	ō	омега

Даследчык, які звярнуў увагу на гэта, заўважае: сярод 22 літар фінікійскага алфавіта няма ні адной, назва якой была б звязана з морам, караблямі або марскім гандлем. Менавіта гэтая акалічнасць падштурхнула яго да думкі, што літары першага алфавіта створаны зусім не фінікійцамі, прызнанымі мараходамі, а хутчэй за ўсё старажытнымі яўрэямі, у якіх фінікійцы гэты алфавіт пазычылі. Але, як бы там ні было, парадак літар, пачынаючы з `алеф, быў зададзены.

Грэчаскае пісьмо, як

Репозиторий ВГУ

ужо гаварылася, узнікла на аснове фінікійскага. У грэчаскім алфавіце літар, якія перадаюць ўсе гукавыя адценні маўлення, стала больш. Але парадак іх і назвы, якія часта не мелі ў грэчаскай мове ўжо ніякага сэнсу, захаваліся, хоць і ў некалькі змененым выглядзе: альфа, бэта, гама, дэльта ...

Спачатку ў старажытнагрэчаскіх помніках літары ў надпісах, як і ў семіцкіх мовах, размяшчаліся справа налева і далей, не перарываючы радок, "вілася" злева направа і зноў справа налева. Прайшоў час, пакуль нарэшце ўсталяваўся варыянт пісьма злева направа, які распаўсюдзіўся на большай частцы зямнога шара.

Лацінскія літары ўзніклі на аснове грэчаскіх, і алфавітны парадак іх прынцыпова не змяніўся. У пачатку I тысячагоддзя н. э. грэчаская і лацінская мовы сталі галоўнымі мовамі велізарнай Рымскай імперыі. Уся антычная класіка напісана на гэтых мовах. Грэчаская – гэта мова Платона, Гамера, Сафокла, Архімеда, Іаана Златавуста. На лацінскай пісалі Цыцэрон, Авідзій, Гарацый, Вяргілій, блажэнны Аўгусцін і іншыя.

А між тым яшчэ да таго, як у Еўропе распаўсюдзілася лацінская азбука, некаторыя еўрапейскія народы ўжо мелі ў тым ці іншым выглядзе сваю пісьменнасць. Даволі самабытнае пісьмо склалася, напрыклад, у германскіх плямёнаў. Гэта так званае "рунічнае" ("руна" ў германскай мове азначае "таямніца") пісьмо. Яно ўзнікла не без уплыву ўжо існаваўшай пісьменнасці. Тут таксама кожнаму гуку мовы адпавядае пэўны знак, але гэтыя знакі атрымалі вельмі простае, прыгожае і строгае напісанне – толькі з вертыкальных і дыяганальных ліній.

Літарна-гукавое пісьмо выступае ў дзвюх разнавіднасцях: кансанантна-гукавое (кансанантна-фанемаграфічнае) і вакалізавана-гукавое (вакалізавана-фанемаграфічнае).

Репозиторий ВГУ

КАНСАНАНТНА-ГУКАВОЕ ПІСЬМО

У пачатку 50-х гг. нашага стагоддзя вядомы амерыканскі граматолаг І.Я. Гельб вылучыў тэорыю, згодна з якой кансанантна-гукавое пісьмо разглядаецца як разнавіднасць складовага пісьма. Гэтая тэорыя выкладзена ў рускім перакладзе яго працы «Вопыт вывучэння пісьма: Асновы граматалогіі». Пункт гледжання І.Я. Гельба на кансанантна-гукавое пісьмо падзяляў савецкі вучоны І.М. Дзьяканаў (*«Аб пісьменстве»*). Аднак у іншых савецкіх навукоўцаў такі погляд пра кансанантна-гукавое пісьмо выклікае шэраг пярэчанняў (*Истрин В.А. «Возникновение и развитие письма»*[19]).

Да асаблівага тыпу адносяцца заходнесеміцкія пісьменствы (фінікійскае, арамейскае, старажытнаяўрэйскае, арабскае і інш.). Звычайна ў складовым пісьме знакі абазначаюць не адзін гук, а некалькі – як правіла, склады, г.зн. спалучэнні галоснага і аднаго або некалькіх зычных гукаў. У заходнесеміцкіх пісьменствах былі толькі знакі для зычных гукаў, якія ў тэксце маглі абазначаць або асобны зычны гук, або спалучэнне гэтага зычнага з любым галосным. Такі тып пісьма называюць кансанантным (лац. consonans – зычны гук). Заходнесеміцкаму пісьму, а менавіта фінікійскаму, было наканавана адыграць у гісторыі чалавечай расы велізарную ролю. Менавіта з яго ўзнікла большасць сучасных пісьменнасцяў, напрыклад, грэчаскае пісьмо, якое дало сучаснаму свету лацінку і кірыліцу. А з лацінскага пісьма ў сваю чаргу ўзніклі англійскае, французскае, нямецкае, іспанскае, італьянскае, польскае, чэшскае і інш., з грэчаскага – славянскае кірылічнае, а з яго – рускае, балгарскае, сербскае, мангольскае пісьмо і многія іншыя. Дарэчы, фінікійцы пісалі справа налева.

Да заходнесеміцкай мовы ўзыходзіць і арамейскае пісьмо, а праз яго – сучасныя арабскае і яўрэйскае. Ад арамейскага пісьма ўзнікаюць і шматлікія індыйскія пісьменствы (кхароштхі, дэванагары і інш.), а таксама армянскае і грузінскае пісьмо. Такім чынам, з распаўсюджаных у свеце пісьменнасцяў толькі кітайская, японская і карэйская не звязаны з фінікійскім пісьмом.

Кансанантнае пісьмо добра падыходзіць для семіцкіх моў, дзе зычныя гукі адыгрываюць асаблівую ролю: корань слова складаецца з зычных (звычайна трох), галосныя, якія спалучаюцца з імі, служаць для словаўтварэння і словазмянення. Гэта падобна на адзін са спосабаў утварэння множнага ліку ў германскіх мовах, напрыклад, у англійскай: man - men (чалавек – людзі), foot – feet (нага – ногі), goose – geese (гусь – гусі). Але ў англійскай мове такіх слоў няшмат, а ў семіцкіх мовах гэта адзіны і рэгулярны спосаб словазмянення. Тэкст на гэтых мовах, запісаны толькі зычнымі літарамі, дастаткова зразумелы (як калі б у беларускай мове запісвалі толькі асновы слоў, напрыклад: *дзяўчынк ід ў школ за рук з мам*). Агульны сэнс відавочны, хоць незразумела, пра адну дзяўчынку сказана або аб некалькіх.

У семіцкіх мовах у галосных і зычных розныя граматычныя задачы. Семіцкае пісьмо развівалася па шляху агаласоўкі кансанантнага тэксту. Гэта азначае, што ў тэкст уводзяцца надрадковыя і падрадковыя (дыякрытычныя) значкі, якія абазначаюць галосныя. Над або пад адпаведным зычным (у выглядзе кропак ці адпаведных значкоў) адзначаецца яго агаласоўка, г.зн. галосны гук, які яго суправаджае. Тэксты, запісаныя семіцкім пісьмом, дзеляцца на тэксты з

Репозиторий ВГУ

агаласоўкай (больш зразумелыя) і без агаласоўкі (менш зразумелыя, але ўсё ж чытабельныя).

Протасінайскае пісьмо. З'яўляецца адной з самых старажытных пісьмовых сістэм семітамоўных народаў. Помнікі гэтага пісьма прадстаўлены ў выглядзе надпісаў на камянях, статуэтках, якія паказваюць багінь. Упершыню надпісы былі выяўлены зімой 1904/05 г. англійскім археолагам Уільямам М. Фліндэрсам Пітры. У цяперашні час навука мае некалькімі дзясяткаў такіх надпісаў. Іх датаванне застаецца пакуль спрэчным. Адны навукоўцы (А. Гардзінер) лічаць, што надпісы адносяцца да XVIII ст., іншыя (К. Зэтэ, Г. Баўэр) – да XVII–XVI стст., трэція (Уільям М. Фліндэрсам Пітры, У.Ф. Олбрайт) – да XV ст., чацвёртыя (І. Гельб) – да XVI–XV стст. да н.э. [5], [19].



Репозиторий ВГУ

Протахааанейскае пісьмо. Протахааанейскае пісьмо, як і протасінайскае, з'яўляецца адной з самых ранніх пісьмовых сістэм старажытных семітаў. Надпісы протахааанейскім пісьмом былі выяўлены ў 30-х гг. XX ст. на тэрыторыі Палесціны. У сувязі з гэтым протахааанейскае пісьмо называюць таксама протапалесцінскім, а надпісы – протапалесцінскімі (або палесцінскімі). Вядома каля 11 протахааанейскіх надпісаў, накрэсленых на чарапках, чыгунах, каменнай пласцінцы, кінжале, залатым пярсцёнку і г.д.

Репозиторий ВГУ



Узоры старажытнахаанейскага пісьма

Угарыцкае пісьмо. Да ліку самых старажытных семіцкіх пісьмовых сістэм адносіцца таксама ўгарыцкае кансанантна-гукавое пісьмо, якое ўжывалася ў XIV–XIII стст. да н.э. (а магчыма, і раней) у адным з паўночных фінікійскіх гарадоў – Угарыце.

Гліняныя пліткі з запісам тэксту клінападобнымі літарамі на семіцкай мове, блізкай да фінікійскай і старажытнаяўрэйскай, былі выяўлены ў 1929 г. французкай археалагічнай экспедыцыяй пры раскопках храмавай бібліятэкі ў горадзе Рас Шамрэй.

Угарыцкае пісьмо было дэшыфравана ў пачатку 30-х гг. нашага стагоддзя французкімі навукоўцамі Э. Дормам, Ш. Вірала і нямецкім даследчыкам Г. Баўэрам.



Репозиторий ВГУ

Фінікійскае пісьмо. Узнікненне фінікійскага кансанантнага пісьма адносіцца да сярэдзіны II тысячагоддзя да н.э., гэта значыць да таго перыяду агульнага развіцця пісьма, калі ў егіпцян ўжо існавалі кансанантна-гукавыя іерогліфы.

Найстаражытныя помнікі фінікійскага пісьма ў выглядзе надпісаў (эпітафія Ахірама, надпісы Асдрубала, Азербай, Абібала, Елібала, Шафатбала і інш.) датуюцца прыкладна XI–X стст. да н.э. Амаль усе яны выяўлены не ў самой Фінікіі, а ў яе калоніях. Больш шырока прадстаўлены надпісы фінікійскім кансанантным пісьмом, якія адносяцца да перыяду з V ст. да н.э. па II–III стст. н.э. [19].

Да нядаўняга часу найбольш распаўсюджанымі, вядомымі яшчэ з антычных часоў, былі егіпецкія тэорыі паходжання фінікійскага алфавіта, якія маюць найбольшую колькасць прыхільнікаў. Паводле гэтых тэорый, правобразам фінікійскіх літар з'яўляюцца або егіпецкія іерогліфы (Ф. Ленарман, І. Галева, В.В. Струвэ), або егіпецкае іератычнае пісьмо (Э. дэ Ружэ, І. Тэйлар), або егіпецкае дэматычнае пісьмо (Ч. Лаўкотка).



Репозиторий ВГУ

Форма буквы	Название буквы	Значение названия	Значение буквы	Форма буквы	Название буквы	Значение названия	Значение буквы
	ʼalef	вол	ʼ		lamed	жало	л
	bet	(дом)	б		mēm	вода	м
	gimel	верблюд	г		nūṇ	(рыба)	н
	dalet	(дверь)	д		sameh	подпорка	с
	he	значение не ясно	h		ʻain	глаз	ʻ
	waw	гвоздь	в		pē	рот	п
	zajin	(оружие)	з		zāde	значение не ясно	ц
	ḥēt	ограда	х		ḳof	обезьяна	к
	ṭēt	груз	т		reš	голова	р
	jod	рука	й		šin	зуб	ш
	kaf	(ладонь)	к		tau	знак	т

Арамейскае пісьмо. На аснове фінікійскага пісьма ўзніклі арамейскае (пач. I тыс. да н.э.) і грэчаскае пісьмо.

Арамейскае пісьмо першапачаткова амаль не адрознівалася ад фінікійскага, але з цягам часу яно пачало набываць свае характэрныя рысы: з'яўляецца імкненне да скарачэння колькасці ліній у некаторых літарах, акругленне вуглоў літар, выкарыстанне лігатур і г.д. Арамейцы (паўночна-заходнія семіцкія плямёны, Іран) сталі аддзяляць словы адно ад аднаго кропкамі і інтэрваламі. На думку Д. Дзірынгера, працэс фарміравання арамейскага пісьма завяршыўся да V ст. да н.э. [11].

Репозиторий ВГУ



Арабскае пісьмо. Арабскае пісьмо (аліфба) – кансанантнае літарнае пісьмо, выкарыстоўваецца ў асноўным для арабскай мовы (اللغة العربية), якая адносіцца да афразійскіх моў. Гэта найбольш позняя галіна літарна-гукавога пісьма, якое ўзыходзіць да арамейскага. Выкарыстоўваецца ў якасці афіцыйнага ў 22 дзяржавах. Акрамя арабамоўных народаў, яно, з некаторымі мадыфікацыямі, ужываецца ў народаў Каўказа, Афганістана, Індыі, Ірана і Пакістана (азербайджанцы, белуджы, брахуі, кашмірцы, панджабцы, персы і інш.). Арабскае пісьмо таксама распаўсюджана ў Сіньцзян-Уйгурскім аўтаномным раёне КНР, Бірме (Аракан), а таксама Камбоджы і паўднёвых раёнах В'етнама (у чамаў).

Репозиторий ВГУ

IPA	Value	Name	Final	Medial	Initial	Isolated	IPA	Value	Name	Final	Medial	Initial	Isolated
[ɖ]	ḍ	ḍād	ـض	ـضـ	ضـ	ض	[ʔ]	ʾ(a)	alif	ـا	ـ	ـ	ا
[ʈ]	ṭ	ṭā’	ـط	ـطـ	طـ	ط	[b]	b	bā’	ـب	ـبـ	بـ	ب
[ʐ]	ẓ	ẓā’	ـظ	ـظـ	ظـ	ظ	[t]	t	tā’	ـت	ـتـ	تـ	ت
[ʕ]	ʿ	ʿayn	ـع	ـعـ	عـ	ع	[θ]	th	thā’	ـث	ـثـ	ثـ	ث
[ɣ]	gh	ghayn	ـغ	ـغـ	غـ	غ	[ʒ]	j	jīm	ـج	ـجـ	جـ	ج
[f]	f	fā’	ـف	ـفـ	فـ	ف	[ħ]	ḥ	ḥā’	ـح	ـحـ	حـ	ح
[q]	q	qāf	ـق	ـقـ	قـ	ق	[x]	kh	khā’	ـخ	ـخـ	خـ	خ
[k]	k	kāf	ـك	ـكـ	كـ	ك	[d]	d	dāl	ـد	ـ	ـ	د
[l]	l	lām	ـل	ـلـ	لـ	ل	[ð]	dh	dhāl	ـذ	ـ	ـ	ذ
[m]	m	mīm	ـم	ـمـ	مـ	م	[r]	r	rā’	ـر	ـ	ـ	ر
[n]	n	nūn	ـن	ـنـ	نـ	ن	[z]	z	zāy	ـز	ـ	ـ	ز
[h]	h	hā’	ـه	ـهـ	هـ	ه	[s]	s	sīn	ـس	ـسـ	سـ	س
[w]	w	wāw	ـو	ـ	ـ	و	[ʃ]	š	shīn	ـش	ـشـ	شـ	ش
[j]	y	yā’	ـي	ـيـ	يـ	ي	[s]	ṣ	ṣād	ـص	ـصـ	صـ	ص

Арабскае пісьмо аказала прыкметны сістэмаўтваральны ўплыў на алфавіт тана, балты, самалі і амхара (у пазначэнні гемінацці і нуль-галоснага). Без малога 7% насельніцтва Зямлі пішуць па-арабску. Гэта 18 арабскіх краін (Алжыр, Бахрэйн, Егіпет, Іарданія, Ірак, Іемен, Катар, Кувейт, Ліван, Лівія, Маўрытанія,

Репозиторий ВГУ

Марока, ААЭ, Аман, Саудаўская Аравія, Сірыя, Судан, Туніс) і 6 іншых дзяржаў: Афганістан, Джыбуці (разам з лацінкай), Іран, Каморскія астравы, Пакістан, Самалі (разам з лацінкай), Судан, Чад, Эрытрэя (разам з эфіопскім пісьмом), Ізраіль (нароўні з яўрэйскім пісьмом), а таксама часткова ў Малі і Сенегале. Сярод іх найбольш буйныя Пакістан, Егіпет, Іран (98-45 млн. чал.). Арабскае пісьмо па колькасці краін, дзе яно з'яўляецца афіцыйным, знаходзіцца на другім месцы пасля лацінкі. Са старажытных часоў арабская мова адрознівалася значнай дыялектнай разгалінаванасцю. Сучасны стан адрознівае 5 дыялектаў: месапатамскі, аравійскі, цэнтральнаарабскі, егіпецкай-суданскі і магрыбскі.

Правамі рэгіянальнага пісьма надзелены арабскі алфавіт у Сіньцзян-Уйгурскім аўтаномным раёне (راي ونى ئاپ تونوم ۇي غۇرئ ئۆشىنجا) Кітая сярод уйгураў і ў правінцыі Індыі Джаму і Кашмір у кашмірцаў. Арабскае пісьмо (разам з арыгінальным сілабарыем тана і малаялам) выкарыстоўваецца ў індыйскім штаце Лакшадвіп мальдыўцамі, якія пражываюць у асноўным на в. Мінікой (Маліку). Арабскае пісьмо для сваёй мовы выкарыстоўваюць курды Турцыі. Акрамя таго, арабскае пісьмо выкарыстоўваецца для азербайджанскай мовы (Іран, Паўднёвы Азербайджан يۇ جانآذربا ىجنوب), казахскай мовы (Ілі-Казахская аўтаномная вобласць وبۇ لىسى ۋتۇ ونومد يالىا قازاق د له), кіргізскай мовы (Кызылсу-Кіргізская аўтаномная вобласць ۋتۇ ونومىي يالىا كىزگىز ۋكىزىلس وبۇ لاسىتى), узбекскай, татарскай і саларскай моў у КНР, а таксама таджыкскай, дары і ўзбекскай мовы ў Афганістане. Арабскае пісьмо найбольш актыўна выцясняецца з неарабамоўнага арэалу. Раней арабскім алфавітам карысталіся ў Малайзіі, Інданэзіі, Мадагаскары, Турцыі, СССР (Сярэдняя Азія, Азербайджан, Паволжа, Паўночны Каўказ), ва Усходняй і Заходняй Афрыцы (для моў суахілі, самалі, хаўса, кануры, луганда, сусу, малінке, валоф, фула, мандынка, берберскіх, мальгашскай, афрыкаанс). Акрамя таго, арабскае пісьмо з'яўляецца культавым (ім напісана свяшчэнная кніга ўсіх мусульман – Каран), таму ў большасці краін, дзе распаўсюджаны іслам, яно суіснуе паралельна з нацыянальным (свецкім) пісьмом.

Максімальнай экспансіі арабскае пісьмо дасягнула ў 8 ст. у часы Арабскага халіфата (إسلامية خلافة), калі ў 711–714 гг. быў заваяваны Пірэнейскі паўвостраў (а таксама Корсіка, Сардзінія, Сіцылія і Балеары), і толькі ў бітве каля г. Пуацье ў 732 г. арабы былі спынены на шляху поўнага заваявання Еўропы. У 1683 г. туркі абклалі Вену, і гэта бітва назаўсёды паклала канец заваявальных паходаў Асманскай імперыі ў Еўропе. Разам з тым гэтыя дзве ісламскія хвалі прывялі да таго, што шэраг еўрапейскіх народаў некаторы час карыстаўся арабскім пісьмом: беларускія татары, албанцы, іспанцы, баснякі (апошняя кніга, надрукаваная арабіцай, выйшла ў 1941 г.). Адны з першых пісьмовых помнікаў мовы афрыкаанс (г. Кейптаўн) былі запісаныя арабскім алфавітам.

У арабскіх паданнях Алах стварыў літары і паведаміў іх Адаму, хаваючы ад анёлаў. Творцам арабскага пісьма часам лічыцца прарок Мухамед, яго асабісты сакратар або адзін з яго сваякоў.

Згодна з арабскай мовазнаўчай традыцыяй, уласна арабскае пісьмо складваецца ў г. Хіра, сталіцы Дахмідскай дзяржавы, і атрымлівае далейшае развіццё ў сяр. 7 ст., пры першым запісе Карана (651 г.). (Каран (ад арабскага قرآن – чытаць) выдаецца часам пад назвай «Аль-Кітаб аль-Мукад-дас»

Репозиторий БГУ

(Свяшчэнная кніга) або «Калам Шарыф» (Высакароднае слова). У Каране 114 лагічна не звязаных глаў (сур). Суры складаюцца з аятаў (вершаў) і размяшчаюцца ў парадку змяншэння колькасці аятаў.)

Арабскія імёны вельмі падрабязна перадаюць генеалогію. Гіяс-ад-Дын Абу-л-Фатх Амар Хайям ібн-Ібрахім аль-Нішапуры, што абазначае Плячо Веры Бацька Заваёўніка Амар Ибрахімавіч Палатачнік з Нішапура стаў вядомы як Амар Хайям, дзе Амар – асабістае імя (алам), а Хайям – мянушка (лакаб). Адны з распаўсюджаных арабскіх імёнаў: Рафік (таварыш), Саід (спадар), Расул (прарок), Рахман (літасцівы), Рахім (міласэрны), Анвар (шмат святла), Вахід (першы), Валід (бацька), Алі (найвышэйшы), Хасан (прыгожы), Джабар (гігант), Джамаль (вярблюд), Джамааль (прыгажосць).

У сучасныя мовы ўвайшлі такія арабскія словы, як факір, сафары, альманах, алгебра, альдэгіды, алкаголь, азімут, зеніт, адмірал, часопіс, казна, магазін, тарыф, вахта, шэрыф.

Лічыцца, што арабскае пісьмо склалася на аснове набатэйскага пісьма (4 ст. да н.э. – 1 ст. н.э.), аднак не варта выключаць і багатую традыцыю сірыйскага пісьма, а таксама фармальную і стылістычную блізкасць літар авестыйскага пісьма.

Арабскае пісьмо перадае пераважна зычныя гукі (асаблівасці арабскай мовы гэта дапускаюць). 28 літар арабскага алфавіта называюцца хуруф (араб. حروف, адз.л. حرف харф). Акрамя іх, у арабскім пісьме выкарыстоўваецца яшчэ тры дадатковыя знакі, якія не з'яўляюцца самастойнымі літарамі алфавіта. Трыма знакамі – ا, ي, و – перадаюцца доўгія галосныя а, і, u. Кароткія галосныя абазначаюцца дадатковымі значкамі («другаснай дыякрытыкай», «агаласоўкамі»). Корань дзеяслова і аддзеяслоўных імёнаў складаецца з трох зычных, якія нясуць асноўнае значэнне (галосныя ўнутры кораня, роўна як прэфіксы і суфіксы, удакладняюць сэнс). Парадак слоў такі, як у кельцкіх і філіпінскіх мовах, – VSO.



Лигатуры

Ф. Фартунатаў называў арабскую мову флектыўна-аглюцінатыўнай, Э. Сэпір – сімволіка-фузіннай, Т. Мілеўскі – альтэрніруючай (па яго словах, «тут наступае сумяшчэнне ўсіх функцый, як семантычных, так і сінтаксічных, у межах слова, якое дзякуючы гэтаму ўтварае нераскладальнае цэлае, што складаецца часцей за ўсё з аднаго кораня».

Адметныя рысы арабскага пісьма:

а) левабаковасць – кірунак радкоў справа налева,

б) багацце надрадковых і падрадковых кропак – дыякрытыкі, якая была ўведзена для распазнання слабаадрознівальных літар і для ўтварэння новых літар,

в) курсіўны характар пісьма, адсутнасць «устава» і вялікіх літар. Прычым курсіўнасць (злітнасць) арабскага пісьма не з'яўляецца паслядоўнай: некаторыя літары злучаюцца з іншымі альбо толькі злева, альбо толькі справа,

г) алаграфія – відазмяненне літар у залежнасці ад іх становішча ў слове: у канцы, сярэдзіне, напачатку ці адасоблена.

Репозиторий ВГУ



Магрибский почерк (дивани)

1 – класічны арабскі почырк (для параўнання);
2 – ізаляваныя формы магрыбскіх літар;
3 – канцавыя формы;
4 – сярэднія формы;
5 – пачатковыя формы;
6 – куфічны почырк (для параўнання).

У 632 г. было заснавана ваенна-тэакратычная дзяржава Арабскі Халіфат, і арабскае пісьмо набывае сусветнае значэнне, да нашага часу яно пераважае на Блізкім Усходзе. Цэнтрам арабскага мовазнаўства з'яўляўся Ірак (гарады Басра і Куфа). У 7 ст. басрыец Абуль-Асуад-ад-Дуалі ўвёў у арабскае пісьмо дадатковыя знакі для абазначэння кароткіх галосных. У гэты ж час Наср ібн-Асым і Ях'я ібн-Ямара стварылі сістэму дыякрытычных знакаў для адрознівання шэрагу падобных па напісанні графем. У 8 ст. басрыец Алъ-Халіль ібн-Ахмед удасканаліў абазначэнне кароткіх галосных. Яго сістэма захавалася да гэтай пары і ўжываецца ў асноўным пры запісе Карана, паэтычных і навучальных тэкстаў.

Прастата, дзіўная пластычнасць арабскага пісьма і яго здольнасць спараджаць усё новыя і новыя почыркі не раз захаплялі паэтаў і філосафаў.

У арабскім пісьме вельмі шмат арыгінальных почыркаў (ад араб. خط hatṭ «лінія»), найважнейшымі з якіх з'яўляюцца: насх (ن سخ «капіраванне»), лічыцца класічным арабскім почыркам і выкарыстоўваецца ў друкарскім наборы; насталік асабліва распаўсюджаны ў Іране, дзе вызнаецца іслам шыіцкага кшталту; магрыбі (Марока, Алжыр, Маўрытанія, Лівія, Туніс); куфі (араб. كوفي, ад назвы горада Куфа) – лічыцца найстаражытным почыркам, яго лініі скупыя і манументальныя.

Репозиторий ВГУ

Насталік

1 – ізаляваныя формы;
2 – пачатковыя формы;
3 – сярэднія формы;
4 – канцавыя формы;
5 – класічны почырк насх (для параўнання).

На працягу многіх стагоддзяў фарміраваўся стэрэатып арабскага пісьма – імкненне літар сцягнуцца ў лінію, па абодвух баках якой нераўнамерна грувасцяцца кропкі. Здаецца, арабскае пісьмо папярэдзіла з’яўленне сучасных метапісьмен – стэнаграфію і коды.

Багацце почыркаў арабскага пісьма можна растлумачыць не толькі яго спецыфічнымі ўласцівасцямі. Так, у круглявасці магрыбскага почырку некаторыя даследчыкі адгадвалі бербера-лівійскі субстрат, у дыяганальнасці насталік – субстрат авестыйскага пісьма. Характэрна таксама, што ярка выяўленыя квадратныя абрысы арабскае пісьмо набывае ў асноўным у Сярэдняй Азіі, дзе, верагодна, былі знаёмыя як з кітайскім квадратным почыркам шанфан-дачжуань, так і з тыбецкім пісьмом пагба.

Репозиторий ВГУ



Древние куфические книжные изводы арабского письма





(1)'llh jfr 'l-'ljh (2)bn 'bydh k'tb (3)'l-xljd ?'ly bny (4)'mry ṣ<lw> 'l<j>h mn (5) [yqrwh]
Аллах, даруй прощение Улайху, сыну Убзйды, писцу из ал-Хулайда, знатнейшему из племени Бану Амр. Молят за него, кто (это читают).
Древнеарабская надпись из Умм-идж-Джимала, 6 в.

Древнекуфическая надпись из Иерусалима, 691.

Архаічны почырк «куфі» характарызуецца адсутнасцю дыякрытыкі. «Квітнеючы куфі» звычайна наносіўся на керамічныя вырабы, «сульс» значыць «адна трэць» (1/3 прамых ліній і 2/3 – мудрагелістых), «рыка» – любімы почырк турэцкіх султанаў, «джавы» выкарыстоўвалі малайскія народы, роўна як і «пегон», дзе дыякрытыка насіла абавязковы характар і перадавала большую колькасць галосных.

куфи
«цветущий куфи»
насталик
сульс
талик
рика
магриби
калеми-разд
джави
пегон

Образцы арабских почерков.



Турецкая печать

Репозиторий ВГУ

Лічбы

0	1	2	3	4	5	6	7	8	9
٠	١	٢	٣	٤, ۴	٥/۵	٦	٧	٨	٩

Паколькі лічбы былі запазычаны з правабаковага індыйскага пісьма, пішуцца яны злева направа (насуперак таму, як пішуцца арабскія літары). Знакі прыпынку такія ж, як у лацінцы, але перавернутыя (коска ўверх нагамі ، ؛) або звернутыя (напрыклад знак пытання ؟) Лічба ۴ выкарыстоўваецца пераважна ў Іране.

Суаднясенне літар арабскага алфавіта з лічбамі ў некаторых містычных плынях ісламу (напрыклад, у суфізме і хуруфізме), верагодна, запазычанае з яўрэйскай кабалістыкі. Заступнік таемных ведаў, арабскі святы Ідрыс (Энох) часам лічыцца першым, хто напісаў літары.

Пра містыку літар і магічных маніпуляцыях з імі пісалі аль-Арабі (1165–1240 гг.), аль-Буни (пам. 1225 г.), аль-Даірабі (пам. 1738), аль-Газалі (1059–1111 гг.) і інш. Сем літар, якія адсутнічалі ў першай суры Карана, вызначаліся як асабліва святыя і суадносіліся з сямю асабліва важнымі імёнамі Бога, днямі тыдня і планетамі. Уяўленне аб сімвалічным значэнні літар алфавіта развівалася перш за ўсё ў хуруфістаў. Паводле вучэння хуруфістаў Бог адкрывае сябе ў чалавечым абліччы, бо імя Бога Алах было напісана на твары чалавека, заснавальніка секты Фадл Алаха з Астэрабада: літара «алиф» утварае нос, крылы носа – гэта два «ляма», вочы ўтвараюць літару «ха». З дапамогай гэтай сімволікі хуруфісты выражаюць асаблівыя адносіны паміж Богам і чалавекам. У іншых, асабліва містычных, кірунках ісламу выкарыстоўвалася «навука пра літары» (Ільм аль-хуруф), у адпаведнасці з якой 28 літар арабскага алфавіта былі падзелены на 4 групы па 7 літар, кожнай групе быў падпарадкаваны адзін з 4 элементаў (агонь, паветра, вада, зямля). У сувязі з лічбавым значэннем літар словы, перш за ўсё імёны Бога, маглі тлумачыцца мантычна. Пры гэтым немалую ролю адыгрывае ацэнка арабскай мовы як мовы адкрыцця Алаха і арабскага пісьма як пісьма, якім быў напісаны Каран.

Агаласоўкі і дадатковыя знакі:

1. Хамза (**هزة** «сціскание») **ء** не адносіцца да агаласовак і абазначае зычны гук (гартанную змычку), але яна звычайна пішацца як дыякрытычны знак; была ўведзена ва ўжытак адначасова з харакатам. Такім чынам, яна займае прамежкавае становішча паміж літарамі арабскага алфавіта і дапаможнымі знакамі арабскага пісьма. У прыватнасці, напісанне хамзы абавязкова нават у неагаласаваным тэксце.

2. Тая-марбута («завязаная тая») **ة** з'яўляецца формай літары тая. Яна пішацца толькі ў канцы слова і толькі пасля агаласоўкі фатха. Калі ў літары та-марбута няма агаласоўкі (напрыклад, у канцы фразы), яна чытаецца як літара ха. Звычайная форма літары тая называецца таа'-мафтууха (араб. مـ ف توحة تـ اء, «адкрытая тая»).

3. Аліф-максура («скарочаны аліф») **ى** з'яўляецца формай літары аліф. Яна пішацца толькі ў канцы слова і скарачаецца да кароткага гука 'а' перад аліф-васла наступнага слова (у прыватнасці, перад прыстаўкай аль-). Звычайная форма літары аліф называецца 'аліф-мамдууда (**ممدودة ألف**, «падоўжаны аліф»).

Репозиторий ВГУ

Харакат (араб. حركات «рух», адз.л. حركة ха́рака) – сістэма надрадковых і падрадковых дыякрытычных знакаў, якія выкарыстоўваюцца ў арабскім пісьме для абазначэння кароткіх галосных гукаў і іншых асаблівасцяў вымаўлення слова, не адлюстраваных літарамі (харфамі). Агаласоўкі тэксту пры дапамозе гэтых знакаў называюць ташкіль (تشكيل).

Фатха (فتحة «расчыненне») – рыса над літарай, абазначае гук а. Адпаведная літара падаўжэння – ا.

Касра (كسرة «ламанне») – рыса пад літарай, абазначае гук і. Адпаведная літара падаўжэння – ي.

Дама (ضمة «злучэнне») – кручок над літарай, абазначае гук у.

Сукун – кружок над літарай (سكون «цішыня»), абазначае адсутнасць галоснай.

Танвін (tanwin تنوين) – падваенне ў канцы слова адной з трох огласовок, якія абазначаюць галосныя гукі, утварае склонавы канчатак (irab إعراب), якое абазначае няпэўны стан гэтага слова і вымаўляецца an, in альбо un у залежнасці ад падвоена агаласоўкі.

Шада (شدة «узмацненне»), або ташдыд – w-падобны знак над літарай, абазначае падваенне літары.

Мада (مدة «падаўжэнне») – хвалістая лінія (тыльда) над літарай аліф, абазначае камбінацыю хамза-аліф альбо хамза-хамза, калі па правілах напісання хамза яна пішацца з падстаўкай аліф. Правілы арабскай арфаграфіі забараняюць ужыванне ў адным слове дзвюх літар аліф запар, таму ў выпадках, калі ўзнікае такая камбінацыя літар, яна замяняецца літарай аліф-мада. Па той жа прычыне ў камбінацыі аліф-хамза-аліф не пішацца аліф-мада – замест гэтага хамза пішацца без падстаўкі. Мада абавязковая да выкарыстання нават у неагаласаваных тэкстах – як і хамза, якую яна замяняе. Таму можна спрачацца, ці адносіцца яна да харакаата, або, падобна хамза, з'яўляецца самастойным знакам арабскага пісьма.

Васла – знак, падобны на літару сад (ٱ), над аліфам у пачатку слова (وصلة «аб'яднанне»), абазначае, што гэты аліф не вымаўляецца, калі папярэдняе слова заканчвалася на галосны гук. Літара аліф-васла сустракаецца ў невялікай колькасці слоў, а таксама ў прыстаўцы аль-. Паколькі ў нерэдукаваным становішчы аліф-васла абазначае хамзу, то іншая назва гэтай літары – хамзату-ль-васл (араб. الوصل همزة, «хамза аб'яднання»).

Надрадковы аліф – знак у форме літары аліф над тэкстам (خنجرية ألف 'аліф ханджарыйя, «кінжальны аліф»), абазначае доўгі гук 'а' ў словах, дзе звычайны аліф не пішацца па арфаграфічнай традыцыі. Сюды адносяцца ў асноўным імёны ўласныя (уключаючы імя Алаха), а таксама некалькі ўказальных займеннікаў. Гэта вельмі рэдкі знак, і акрамя як у Каране ён звычайна не ўжываецца.

У адрозненне ад нязлітнага пісьма, у якім для выраўноўвання шырыні радкоў ўжываецца разрадка слоў і міжслоўных прабелаў, арабская вязь дазваляе расцягваць радкі за кошт падаўжэння звязак паміж літарамі. Падоўжаная звязка называецца кашыда (перс. كشيده) або татвіль (араб. تطويل).

У малайскай арабіцы была пашырана колькасць агаласовак. Надрадковыя знакі: е - с ее - сс, о - эс аб - эʔ і г.д. Гэтая сістэма агаласовак захавалася ў гібрыдным пісьме тана.

Репозиторий ВГУ



Некаторыя почыркавыя разновіднасці арабскага пісьма (зверху ўніз – «дывані», «магрэб», «талік» і «насталік»).

Кожны турэцкі султан прыдумваў сваю ўласную мудрагелістую манаграму – тугру. Яе змяшчалі на дакументах, манетах і нават на будынках.

Узор арабскага арнаментальнага пісьма.

Лацінізацыя арабскага пісьма ўпершыню была ажыццёўлена ў Азербайджане пад кіраўніцтвам Н. Нарыманова ў 1922 г. Пытанне лацінізацыі азербайджанскай мовы ўздымалася яшчэ ў 1906г., а ажыццёўлена ў 1929 г. Турэцкая мова лацінізавана ў 1928 г., што стала сур'ёзным ударам і падарвала пазіцыі арабіцы. Яшчэ раней (у пач. 20 ст.) Ад арабскага алфавіта адмовіліся ў Інданэзіі (найбуйнейшай мусульманскай краіне). У суседніх Малайзіі і Сінгапуры на лацінку перайшлі значна пазней – пасля 1957 г. У СССР пісьменнасць на аснове арабскага алфавіта была забаронена ў 1929 г. пастановай ЦВК і Саўнаркама, а распрацоўшчыкі рэфармаванай арабікі рэпрэсіраваныя. Дарэчы сказаць, нідзе, акрамя Татарстана, замена арабскай графікі (аліфбы) лацінкай (яналіф) не выклікала сур'ёзнага супраціўлення. Да 1917 г. у Расійскай імперыі

Репозиторий ВГУ

арабіца выкарыстоўвалася для 16 моў. У сяр. 1920-х гг. рэфармаваныя варыянты арабіцы былі распрацаваны для башкірскай, казахскай, кіргізскай, крымска-татарскай, курдскай, татарскай, туркменскай, уйгурскай, узбекскай, чачэнскай, інгушскай, адыгейскай, кабардзінскай, чаркескай, аварскай, даргінскай, кумыкскай, лезгінскай, лакскай, карачан-балкарскай, каракалпакскай моў.

Мусульмане свету аб'яднаны ў шэраг арганізацый, найважнейшыя з якіх: з 1945 г. – Ліга арабскіх дзяржаў (الـ عربـ ية الـ دول جامعة), пры якой дзейнічае Інстытут арабскай пісьменнасці; з 1969 г. Арганізацыя Ісламская канферэнцыя, якая аб'ядноўвае звыш 40 дзяржаў (у тым ліку Албанія, Сурынам, Гаяна, Мазамбік, Уганда, Габон; РФ, Боснія і Герцагавіна і Тайланд маюць статус назіральнікаў).

ПРЫКЛАДЫ

Тэкст на класічнай арабскай мове:

وضميراً عقلاً وهبوا وقد .والـحـقوق الـ كرامة فـ ي مـ تـساويـ ن رارأًح الـ ناس جمـ يع يـ ولـ د
الإخاء بـ روح بعضاً بـ عـضهم يـ عامل ان وعـ لـ يهم.

Yūladu jamī'u n-nāsi aḥrāran mutasāwīna fī l-karāmati wa-l-ḥuqūq. Wa-qad wuhibū 'aqlan wa-ḍamīran wa-'alayhim an yu'āmila ba'ḍuhum ba'ḍan bi-rūḥi l-ikhā'.

ПЕРАКЛАД:

Усе людзі нараджаюцца свабоднымі і роўнымі ў сваёй годнасці і правах. Яны надзелены розумам і сумленнем і павінны ставіцца адзін да аднаго ў духу братэрства. (З «Дэкларацыі правоў чалавека»).

ВАКАЛІЗАВАНА-ГУКАВОЕ ПІСЬМО

Вакалізавана-гукавое пісьмо ўяўляе наступны этап у развіцці літарна-гукавога пісьма. Узнікненне яго адносіцца да пачатку I тысячагоддзя да н.э. і звязана з абазначэннем на пісьме як зычных, так і галосных гукаў (фанем).

Грэчаскае пісьмо. Першы крок у абазначэнні літарамі не толькі зычных, але і галосных гукаў быў зроблены старажытнымі грэкамі. Прычынай такога пераходу ад кансанантнага пісьма да вакалізаванага паслужыла тое, што ў грэчаскай мове карані слоў і афіксы складаліся як з зычных, так і з галосных гукаў.

Пытанне аб часе ўзнікнення грэчаскага вакалізавана-гукавога алфавіта вельмі складанае. На гэты конт выказваюцца самыя розныя здагадкі. «Паміж двума крайнімі перыядамі, якімі датуюць вынаходства грэчаскага алфавіта, гэта значыць паміж XV ст. да н.э. і VIII ці VII ст. да н.э., няма стагоддзя, якое не мела б сваіх прыхільнікаў» (*Дирингер «Алфавит»*). Напрыклад, вядомы гісторык пісьма I. Гельб лічыць пачаткам фарміравання грэчаскага літарна-гукавога пісьма IX да н.э., а не менш аўтарытэтны спецыяліст у галіне гісторыі пісьма Д. Дзірынгер мяркуе, што яно існавала ўжо ў XI ст. да н.э. (*Дирингер «Алфавит»).*

Першапачаткова грэкамі (грайкі) называлася ілірыйская (эпірская) народнасць, міфалагічны прабацька якога насіў імя Грэк (Γραικός; у грэчаскай міфалогіі сын Пандоры, малодшай дачкі Дэўкаліёна). Гэтым імем рымляне называлі і ўласна элінаў (Ἕλληνες). На Усходзе грэкаў называюць іанійцамі ў мясцовым вымаўленні – іона на палі, явана на санскрыце, яванім на іўрыце.

Репозиторий ВГУ

Напачатку «элінамі» называлі насельніцтва Фесаліі, а «грэкамі» – адно з плямёнаў на поўначы Грэцыі (параўн. гг. Грая ў Беотыі і на в. Эўбея).

Грэчаскі алфавіт шырока выкарыстоўваецца ў навуковых дысцыплінах: у астраноміі для абазначэння найбольш яркіх зорак у сузор'ях, у матэматыцы для абазначэнне пераменных, каэфіцыентаў, канстант, дзеянняў (напрыклад, сумаванне - Σ), у геаметрыі для абазначэння вуглоў, плоскасцяў, часам фігур, у фізіцы для абазначэння многіх фізічных велічынь, канстант і інш.; у хіміі часам грэчаскія літары ўжываюцца ў наменклатуры арганічных злучэнняў.

У перыяд позняй антычнасці вынаходнікам грэчаскага пісьма лічыўся бог гандлю Гермес. Навуковыя асновы вывучэння грэчаскага пісьма былі закладзеныя «бацькам палеаграфіі» Манфаконам («Грэчаская палеаграфія», 1708 г.). Па апошніх дадзеных, грэчаскае пісьмо ўзнікла прыблізна ў 9-8 стст. да н.э. Архаічнае грэчаскае пісьмо было левабаковым (сустракаўся і бустрафедон), але затым радкі сталі пісаць толькі злева направа. У адрозненне ад фінікійскага прататыпу, у грэчаскае пісьмо былі ўведзены знакі для галосных. Гэта з'явілася новым этапам у развіцці пісьма: кансанантнае пісьмо заходнесеміцкага тыпу было ператворана ў паўнавартасны алфавіт.



Грэчаскае пісьмо – літарнае пісьмо, якое генетычна ўзыходзіць да фінікійскага. Абслугоўвае грэчаскую мову (індаеўрапейскія мовы) – ελληνικά, або ελληνική γλώσσα. Афіцыйнае пісьмо Грэцыі (Ελλάδα) і Кіпра (Κύπρος; у асноўным на поўдні вострава). Да 1908 г. грэчаскае пісьмо з дыякрытычнымі знакамі

Репозиторий ВГУ

ўжывалася для албанскай мовы ў Паўднёвай Албаніі, а да сяр. 19 ст. выкарыстоўвалася ў шэрагу македонскіх і балгарскіх тэкстаў.

Α,	α′,	1.	Ι,	ι′,	10.	Ρ,	ρ′,	100.
Β,	β′,	2.	Κ,	κ′,	20.	Σ,	σ′,	200.
Γ,	γ′,	3.	Λ,	λ′,	30.	Τ,	τ′,	300.
Δ,	δ′,	4.	Μ,	μ′,	40.	Υ,	υ′,	400.
Ε,	ε′,	5.	Ν,	ν′,	50.	Φ,	φ′,	500.
	ϛ′,	6.	Ξ,	ξ′,	60.	Χ,	χ′,	600.
Ζ,	ζ′,	7.	Ο,	ο′,	70.	Ψ,	ψ′,	700.
Η,	η′,	8.	Π,	π′,	80.	Ω,	ω′,	800.
Θ,	ϑ′,	9.	Ϙ,	ϙ′,	90.		ϡ′,	900.

Існуе гіпотэза аб некалькіх пластах грэчаскага алфавіта: 16 літар былі запазычаны з фінікійскага пісьма (легендарным Кадмам), Паламед у Траянскую вайну дадаў 4 новыя літары – Θ, Φ, Χ, Ξ, а паэт Сіманід – яшчэ 4 літары Η, Ψ, Ω, Ζ.

1	2	3	4	5	6	7	1	2	3	4	5	6	7
Α	α	𝒜	𝒶, 𝓐	1	а	альфа	Ξ	ξ	𝒳	𝓍, 𝓏	60	кс	кси
Β	β	ℬ	𝒷, 𝓑	2	в	вита	Ο	ο	𝒪	𝓸	70	о	омикрон
Γ	γ	𝒢	𝓰	3	г	гамма	Π	π	𝒫	𝓅	80	п	пи
Δ	δ	𝒟	𝒹	4	д	дельта	ϙ	ϙ			90		коппа
Ε	ε	ℰ	𝒆, 𝓔	5	э	эпсилон	Ρ	ρ	𝒫	𝓇	100	р	ро
ς	ς			6		стигма	Σ	σ, -ς	𝒮	𝓈, -𝓈	200	с	сигма
Ζ	ζ	𝒵	𝓏, 𝒻, 𝓕	7	з	зита	Τ	τ	𝒯	𝓉, 𝒯	300	т	таф
Η	η	ℋ	𝓃, 𝓖	8	и	ита	Υ	υ	𝒱	𝓋	400	и	ипсилон
Θ	θ, ϑ	𝒱	𝒽	9	θ	тита	Φ	φ	𝒫	𝓅, 𝓕	500	ф	фи
Ι	ι	𝒥	𝒾	10	и	йота	Χ	χ	𝒳	𝓍, 𝓌	600	х	хи
Κ	κ, ϰ	𝒦	𝓀, 𝓚	20	к	каппа	Ψ	ψ	𝒴, 𝒲	𝓎	700	пс	пси
Λ	λ	ℒ	𝓁, 𝓛, 𝓁	30	л	ламбда	Ω	ω	𝒲	𝓌	800	о	омега
Μ	μ	ℳ	𝓂	40	м	ми	ϡ	ϡ			900		сампи
Ν	ν	𝒩	𝓃	50	н	ни	F						дигамма

Класічны грэчаскі алфавіт.

1 – вялікія літары грэчаскага алфавіта (літары ϱ, ς, ϡ з'яўляюцца т.зв. эпісемамі, г.зн. абазначаюць толькі лікі);

2 – малыя літары грэчаскага алфавіта (ς пішацца ў канцы слова, з'яўляючыся семітычным рудыментам, рэшткай сістэмы алаграфаў);

3 – курсіўная вялікія літары грэчаскага алфавіта;

4 – курсіўныя малыя літары грэчаскага алфавіта;

5 – лікавыя значэнні літар;

6 – транскрыпцыя;

7 – графонімы (назвы літар).

Рэпозиторий ВГУ

Найстаражытныя пісьмовыя помнікі на старажытнагрэчаскай мове адносяцца да 14–12 стст. да н.э. і напісаны эгейскімі пісьмёнамі (крыцкае пісьмо, кіпрскі сілабарый). Грэчаская пісьменнасць выкарыстоўвалася ў некаторых мовах Блізкага Усходу, Прычарнамор'я і блізкіх абласцей, напрыклад, для запісу бактрыйскай мовы (цар Канішка ўвёў літару Þ [š] шо; літара англасаксонскай і ісландскай пісьменнасці тхорн падобная на шо, але не ўзыходзіць да яе) у Кушанскім царстве. Ёсць сведчанні аб ужыванні грэчаскага пісьма да асецінскай (Зеленчукскі надпіс, 11–12 стст.) і адыгейскай моў.

У Асманскай імперыі сустракаліся запісу грэчаскай мовы турэцкай арабіцай і наадварот – турэцкай мовы грэчаскімі літарамі (karamanlidika). Грэчаскі алфавіт выкарыстоўвалі некаторыя цюркскія народы, якія, як правіла, вызнавалі праваслаўе: гагаузы (у асноўным для выдання праваслаўнай рэлігійнай літаратуры), гаджалы (балканскія гагаузы-мусульмане ў раёне гг. Бітола і Куманава, на макендонска-грэчаскай мяжы, а таксама ў г. Эдырне і ў паўночна-ўсходняй Балгарыі), караманлы каля г. Карман ў турэцкай Кападокіі (знік пасля 1923), урумы (цюрка-рамейцы паўночнага Прычарнамор'я, у асноўным ва Украіне; у 1920–30-я гг. ва ўрумскіх сёлах выкладалася крымскататарская мова, у цяперашні час выкарыстоўваецца кірылічная пісьменнасць, але афіцыйна яна не зацверджана і ў розных крыніцах выкарыстоўваюцца розныя варыянты алфавіта), насельніцтва, якое гаварыла на цюрка-грэчаскай мове Эпіра.

